САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ВЫДАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучэйце

Кошт нумару — 5 руб. 50 к.

Падпісная плата—
Звычайная—225 р. льготная—125

Плата за абвесткі — [illegible] руб. за радок пет.
Сьпістныя—на 50% дарожэй.
Плата за публікацыю аб страце дакумэнтаў
За 1 дакумэнт—300 руб.
1 кніжка ашчадковая—200 руб.
1 кніжка кнітанцыі—100 руб.
Чырвон. і атрымальнікам Сац. Забеспячэння—[illegible]
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў Кнігабанцтве пры Дзяржаўным Выдавецтве (Менск, Петраградская, 8).

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: МЕНСК, Петраградская, 28.

ТРЭЦІ ГОД ВЫДАНЬНЯ. Штодзенная газэта. № 221 (626). Чацьвер, 5-га кастрычніка 19[illegible] г.

Пісьмо да старшыняў сельскіх саветаў.

Савецкая Беларусь, разам са ўсімі іншымі Савецкімі Рэспублікамі, распачала збор харчовага падатку. І сёлета, таксама, як і летась, цэнтральныя органы Савецкай улады Расейскай Фэдэрацыі, ва ўсіх сваіх пастановах, ставяць перад усімі працоўнымі грамадамі заданьне—абавязкова сабраць адзіны натуральны падатак к адзначанаму тэрміну.

Летась, калі Савецкая ўлада ўводзіла харчовы падатак, яна думала, што зможа значную частку харчовага падатку адда[illegible] на аднаўленьне нашай народнай гаспадаркі, буйных фабрык і заводаў, без якіх ня можа быць адноўлена і сельская гаспадарка.

Але летась на нас навалілася нячуваны голад. Прыйшлося адмовіцца ад цэлага шэрагу гаспадарчых прац і ўсё кінуць у галадуючае Паволжа. Прыйшлося яшчэ на год павінуць на голад данецкага шахцёра і ўральскага мэталіста, каб выратаваць ад галоднай сьмерці сялян Паволжа.

І сёлета мы прымушаны кінуць шмат сродкаў дзеля адбудаваньня разбуранай сельскай гаспадаркі на Паволжы. Створан спэцыяльны 30-міліённы насённы запас, адпускаюцца спэцыяльныя сродкі дзеля ўтварэньня сельска-гаспадарчага крэдыту,—робіцца ўсё, каб дапамагчы селяніну Паволжа хутчэй аднавіць сваю гаспадарку.

Але сельская гаспадарка ня можа добра існаваць бяз буйнай прамысловасьці. Вёска ня можа жыць бяз добра працуючай чыгункі і сельская гаспадарка ня можа абыйсціся бяз сельска-гаспадарчых прыладаў.

Наша прамысловасьць, фабрыкі і заводы разбурваліся ўвесь час. Зараз трэба энэргічна ўзяцца за іхнае адбудаваньне. Чужаземныя дзяржавы нам дапамогі ня хочуць. Яны хочуць, каб мы раней вярнулі панам зямлю і капіталістам фабрыкі—толькі тады яны нам дадуць якую-колечы дапамогу.

Савецкая ўлада на гэты шлях ісьці ня хоча і ня пойдзе. Дзеля гэтага яна рашыла сваімі ўласнымі сіламі узяцца за аднаўленьне нашай гаспадаркі. Праца гэта цяжкая, [illegible] значна марудней, але [illegible] гэта сами зробім і не [illegible] ласкі свабоды чужаземцу.

[illegible] павярху пусьціць у ход [illegible] рабочага чыгуначніку, яму магчымасьць [illegible] станка, а ня [illegible] б пасьля пра[illegible], каб не [illegible].

[illegible] ўлада кажа [illegible] харчовы падатак [illegible], якія б дзяржаўнай [illegible] трэба выпаўніць [illegible] ючы запамічаньні [illegible] усаў.

Беларусь лепш за іншыя часткі Савецкай Федэрацыі помніць прыгнечаньне чужаземнага пана, польскага пана, помніць, як капіталісты прыгнаталі сялян, адбіралі ў іх апошнае, разбурвалі сялянскую гаспадарку, выганялі на вуліцу сялянскую сям'ю.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларусі і Цэнтральнае Бюро Камуністычнай Партыі Беларусі заклікаюць вас зрабіць усё магчымае, каб харчовы падатак быў сабраны своечасова і поўнасьцю.

У некаторых раёнах збор падатку праходзе вельмі добра. Ёсьць воласьці, якія ўжо поўнасьцю здалі харчовы падатак. Ёсьць воласьці, якія пад чырвонымі сьцягамі з рэвалюцыйнымі сьпевамі пад правадырствам сваіх старшынь валасных выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў прывозілі падатак, добра разумеючы, што сваімі выплатамі яны б'юць заняпад, дапамагаюць будаваць нашу гаспадарку.

Але ёсьць і такія гаспадаркі, дзе харчова-падатковая кампанія ідзе яшчэ слаба. У такіх раёнах трэба найхутчэй раскалыхацца, растлумачыць сялянам неабходнасьць здачы падатку.

Летась Савецкая Беларусь адна з першых выканала харчовы падатак. Мы пэўны, што і сёлета мы будзем на адным з першых месц.

Памятай жа, таварыш, што ад збору харчовага падатку залежыць лёс нашага гаспадарчага будаўніцтва, а ад замацаваньня нашай гаспадаркі залежыць магутнасьць Савецкай улады.

Памятай, што ў Данскім басэйне, на Урале і ў Чырвонай арміі чакаюць хлеба.

Памятай, што данецкі шахцёр атрымлівае пакуль што на сябе і на сям'ю ня больш 2-х пудоў хлеба ў месяц, бяз тлустасьцяў, бяз мяса, за сваю катаржную працу пад зямлёй.

Памятай усё гэта, растлумачгэта тым выбірацелям, растлумачім, якую значнасьць мае харчовы падатак.

Памятай гэта, таварыш. Зрабі сваю справу па-рэвалюцыйнаму, зьбяры падатак к тэрміну і поўнасьцю.

Савецкая ўлада Беларусі і Камуністычная Партыя, кіруючая гэтай уладай, пэўны, што ты гэта заданьне выпаўніш.

З таварыскім прывітаньнем

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў, Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў Старшыня Савету Народных Камісараў Беларусі А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Камуністычнай партыі Беларусі В. Багуцкі.

Загаворы.

Загавор урангэльцаў супроць баўгарскага ўраду.

ЗОФІЯ, 30—9. Баўгарскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе, што паліцыя захапіла пагаемны архіў прадстаўнікаў урангэльскай арміі. У гэтым архіве было шмат такіх дакумэнтаў, з якіх відаць, што ўрангэльскае войска зьбіралася скінуць баўгарскі ўрад. Урангэльцы, падгатаўляючы пераварот, спадзяваліся на падтрыманьне некаторых варожых к ураду палітычных груп.

Супроць безрабоцьця і дарагоўлі.

ПРАГА, 30—9. Па ініцыятыве чэскіх камуністаў у Празе была наладжана дэманстрацыя супроць безрабоцьця і дарагоўлі. У выніку дэманстрацыі кошты на харчовыя рэчы сталі значна паніжацца.

Расправа з камуністамі.

ВАРШАВА, 30—9. У Львове пачалося слуханьне справы 39 членаў камуністычнага кангрэсу, арыштаванага летась у памяшканьні царквы сьвятога Гэорга.

Антысэмітызм у Польшчы.

ВАРШАВА, 1-10. У Горадні, Беластоку, Седлецы і некаторых другіх гарадах Усходняй Польшчы пагромная арганізацыя «Розвуй» паклеіла плёкаты з клічам к жыхарству аб выгнаньні жыдоў з Польшчы. На плёкатах намалёваны польскі салдат з мацёнкай, выганяючы з сьвіна капукоў. Ва ўсіх капукоў жыдоўскія галовы. У Седлецы некалькі жыдоў спрабавалі сарваць плёкаты, тагды грамада польскай моладзі, якой кіравалі развойны, пачала біць жыдоў.

Высылка белагвардзейцаў.

САФІЯ, 1-10. У Тарнове арыштаваны і высланы ў Сафію звыш 50 белагвардзейцаў. Усе яны павінны былі быць высланы з Сафіі ў Сэрбію, аднак сэрбскае консульства адмовілася прыняць іх, і арыштаваныя заключаны ў канцэнтрацыйны лягэр.

Фашысты ў Вэнгрыі.

БУДАПЭШТ, 30-9. У Будапэшце арганізавана партыя вэнгерскіх фашыстаў. Заснаваў гэтую партыю Сьцяпан Фрыдрых. Арганізацыя носіць назву «Прабуджэньне вэнграў».

Дэманстрацыя супроць дарагоўлі.

БЭРЛІН, 2-10. У наладжанай фабрычна-заводзкімі камітэтамі дэманстрацыі супроць дарагоўлі прымала ўдзел 25.000 чалавек. У горадзе быў спынены на 2 гадзіны трамвайны рух.

У Ірляндыі.

ЛЁНДАН, 30—9. У Ірляндыі ўсё яшчэ не спакойна. Паўстанцы расыпаліся па ўсёй краіне невялікімі групамі і нападаюць на ўрадавае войска.

Прыезд тав. ЧЫЧЭРЫНА.

Учора, 4 кастрычніка, на граніцы тав. Чычэрына сустрэлі прадстаўнікі Нар. Кам. Замежных Спраў Беларусі, які вітаў яго ад ураду Савецкай Рабоча-Сялянскай Беларусі.

А 7-ай гадзіне ўвечары тав. Чычэрын прыехаў у Менск. В гэтаму часу на вакзале сабралася многатысячная грама[illegible] рабочых і рабочай моладзі, якія горача віталі кіраўніка чырзоняй дыпляматыі.

У адказ на прывітаньне тав. Чычэрын абышоў рады сабраўшыхся рабочых і зьвяртаўся да іх з прамовамі.

У кароткай гутарцы з прадстаўнікамі прэсы тав. Чычэрын адзначыў, што міжнароднае становішча Р.С.Ф.С.Р. у сучасны момант моцнае і з кожным днем усе больш і больш мацнее.

„Першыя мае ўражаньні,—сказаў тав. Чычэрын,—пасьля 6-месячнага прабываньня ў Заходняй Эўропе, самыя найлепшыя. Тое, што мяне рабочая кляса г. Менску так горача вітае, я лічу знакам моцнага ўнутранага становішча Савецкай Рэспублікі".

Каля 9-ай гадзіны тав. Чычэрын адбыў на Маскву.

Пратэст Р. С. Ф. С. Р. супроць блекады Чорнага мора.

Нота намесьніка Народнага Камісара па Чужаземных Спраўах Т. М. Карэтана, адпасланая міністру чужаземных спраў Вялікабрытаніі лёрду Керзану ў Лондан, прадстаўніку савета міністраў і міністру чужаземных спраў Францыі Пуанкарэ ў Парыж, міністру чужаземных спраў Італіі Шаніэру ў Рым.

Пасьля няўдачных спробаў эўрапейскіх дзяржаў агульнымі натугамі дапамагаць аднаўленьню ўсяго[illegible]ай гаспадаркі на канфэрэнцыях у Генуі і Гаазе расейскі ўрад прымушан быў уласнай сілай прапягаць працу па аднаўленьню народнай гаспадаркі Рэспублікі, разбуранай вайной і інтэрвэнцыяй. У галіне гэтай працы расейскі ўрад арабіў шэраг заказаў у эўрапейскіх краёх і Амэрыцы. Галоўная частка заказаных тавараў, часткай нагружаных на караблі, была адпраўлена і адпраўляецца найбольш спадручным марскім шляхам праз пралівы ў порты Чорнага мора. Зусім нечакана расейскаму ўраду стала відома, што Вялікабрытанія, абапіраючыся на свой флёт, блёкравала Дарданэлы і Басфор, забараніўшы праход праз пралівы ўсім гандлёвым караблём, якія ідуць з Чорнага мора ці ў чорнаморскія парты. Больш таго: вялікабрытанскае камандаваньне загадала вайсковым караблём страляць на ўсіх караблёх, якія пакушаюць забарону аб спыненьні руху караблёў.

Расейскі ўрад павінен самым катэгарычным чынам пратэставаць супроць гэтай блёкады, заснованай Вялікабрытаніяй бяз ведама Расеі і пярэчачых ле інтарэсам.

Дзяржавы Антанты, адмовіўшыся аднавіць з Расеяй, ня гледзячы на яе ўступкі, нармальныя эканамічныя зносіны для адчаўленьня расейскай народнай гаспадаркі, блёкіруючы пралівы, ніводзін расейскаму ўраду працаваць у гэтым напрамку нават сваёй уласнай сілай.

Расея пратэставала ўжо супроць таго, што дзяржавы наблядзіцельнага заснавалі ў пралівах рэжым, накіраваны супроць інтарэсаў Расеі і яе саюзьнікаў.

Абвешчаная цэлер блёкада пралівах пацьвярджае, што дзяржавы, незацікаўленыя ў плаваньні па Чорнаму мору, але кантралірующыя сваёй вайсковай сілай пралівы, будуць заўсёды перашкодзіць мірнаму гаспадарчаму жыцьцю чорнаморскіх дзяржаў. Свабода пралівах, без якой Расея рыхтуецца к новаму пралівах, лічыцца толькі вабо[illegible] дзяржаў Антанты блёкіраваць [illegible] бы час і над любой прычы[illegible] пралівы і гэткім шляхам адр[illegible] Чорнае мора ад астатняга [illegible] Расейскі ўрад стаіць за св[illegible] пралівах, але за гэтую св[illegible] дзецца толькі гандлёвы[illegible] якая вялізнае і пралівы [illegible] мора ад усякай прысуты[illegible] вайскова-марскіх сіл.

Вялікабрытанія [illegible] блёкада пралівах [illegible] перарваць жыцьцёвых марскіх шляхаў, іх на[illegible] гаспадарцы блёкада ня можа [illegible] пашкодзіць, яна [illegible] гаспадарчае становішча чорнаморскіх дзяржаў.

Толькі поўнай ізаляцыяй [illegible] інтарэсам чорнаморскіх дзяржаў, можна [illegible] лёгкасьць, з якой Вялікабрытанская ўлада распараджаецца ў чужых марах і тэрыторыях.

Расейскі ўрад гэтым патрабуе адмены блёкады пралівах і [illegible] жаваньняў, якія датыкаюцца [illegible] боднага праходу гандлёвых [illegible] праз Дарданэлы і Басфор[illegible] і заснованы і ўжыванне [illegible] брытаніяй і яе саюзьнікамі.

Намесьнік Народнага [illegible] Чужаземных справах [illegible]

Маскв[illegible]

У Савецкай [illegible]

Ленін пачаў працаваць [illegible]

МАСКВА, 3-10. Учарайшнее [illegible] сяджэньне вялікага Савету Народных Камісараў адбывалася пад старшынствам Леніна, які вярнуў выкананьню абавязкаў [illegible] Савету Народных Камісараў.

Апошнія навіны.

Амэрыку выяжджае ангельская дэлегацыя дзеля перамаўвадам Амэрыкі па пытаньню аб умеркаваньні міжсаюзьў і рэпарацыі. Дэлегацыя вернецца ў Эўропу ў пачатку пасьля чаго ў Брусэлі будзе скліканая канфэрэнцыя. Брукінфэрэнцыя выраш ць пытаньне аб умеркаваньні міжсаюзьугоў яшчэ да канца году, бо да 31-га сьнежня павінен быць ён плян нямецкіх плацяжоў на 1923 год.

— Рэпарацыйная камісія пастанавіла, што Нямеччына абавязана за рахунак належачага доўгу Паўднёвай Славіі забясьпечыць тавою пасажырскімі і таварнымі вагонамі.

— Агульная кампанія электрыцтва ў Нямеччыне звольніла з аднаго пэху каля 10.000 чалавек рабочых, якія патрэбавалі павышэньня заработнай платы.

— Ангорскі нацыянальны збор аднагалосна адобрыў палітыку ангорскага ўраду ў галіне падгатоўкі к тымчасовай мірнай канфэрэнцыі, якая павінна адбыцца ў Мэданіі.

— Па згодзе з саюзьнікамі тымчасовая канфэрэнцыя па бліжня-усходняму пытаньню адбудзецца ў Мэданіі.

— Ангорскі нацыянальны збор упаўнаважыў Кемаль-пашу спынець варожыя чынасьці на ўсім грэка-турэцкім фронце.

— У Мэданію выехала турэцкая місія на чале з начальнікам гэнэральнага штабу кемалісцкай армії Ісьмед-пашы.

— 1-га кастрычніка падпісана перамірра паміж грэкамі і туркамі. На ўсім грэка-турэцкім фронце вайсковыя чынасьці спынены.

Друк пры новых умовах.

(На пленуме цэнтральнаго бюро сэкцыі працаўнікоў друку).

Чарговы пленум цэнтральнага бюро сэкцыі працаўнікоў друку адчыніўся 1-га кастрычніка ў Будынку друку.

Прыехала на пленум шмат дэлегатаў з абласных і губэрскіх цэнтраў. Першае пасяджэньне пленуму было ахвяравана заслуханьню дакладу т. Бубнова: «Друк пры новых умовах».

Дакладчык пачаў з зазначэньня, што з прычыны зьмяніўшыхся абставін, наш друк цяпер спатыкае варожыя адносіны і перажывае вялікі крызіс. Знаходзячыся ў абкружэньні НЭП'а эканамічнага і НЭП'а ідэолёгічнага друк павінен весьці барацьбу з імі. З абкружэньнем наш друк варожым ідэалёгічным кальцом ён павінен весьці нямыя схваткі, вытрымліваць барацьбу, павінен атрымліваць пабеды. Аднак умовы, пры якіх прыходзіцца працаваць, не даюць яму магчымасьці весьці гэту барацьбу з поспехам. НЭП душыць друк і ў эканамічных адносінах. Фінансава-гаспадарчы крызіс друку ня спыняецца. Лік газэт зьменшыўся, цiраж іх увесь час ляціць уніз. На 1-га студзеня былі 803 газэты па ўсёй Фэдэрацыі, на 1-га жніўня іх засталося 299; цiраж усіх газэт на 1-га студзеня раўнаўся 2.661.000 экзэмпляраў, на 1-га жніўня—993.000 экзэмпляраў. Апрача гэтага, на мясцох няма правідловых адносін к друку. Ён б'ецца ў цісках бюрократычных адносін к яму з боку шэрагу савецкіх і партыйных установаў. Дакладчык цытыруе меньне «Варонескай Камуны», якім зазначаецца, што па ўсім Варонескай губэрні ўсяго 128 экз. гэтай ным павятовыя выканаўчыя і партыйныя і паветаў Бранскі

Ясна, што пры такім становішчы друк на мясцох выяўляе сабой досыць сумны малюнак.

Што трэба зрабіць дзеля палепшаньня становішча друку? Практычныя прапанаваньні дакладчыка гэткія: трэба каб журналы і газэты вялі барацьбу з буржуазнай ідэолёгіяй досыць згуртавана і энэргічна. Газэты павінны быць мясцовымі, асьвятляць, галоўным чынам, мясцовае жыцьцё. Дзеля палепшаньня фінансава-гаспадарчага становішча газэт тав. Бубноў прапануе, радам з узмацненьнем апарату пашырэньня калектыўнай і абвязковай падпіскі, прадстаўленьне газэтам магчымасьці здабыць уласныя друкарні. Ён прапануе прыняць за грунт рэзалюцыі матар'ял, які дала прыватная нарада дэлегатаў (сэкратароў губэрскіх партыйных камітэтаў, аддзелаў агітацыі і прапаганды і журналістаў) астатняй усерасейскай партыйнай канфэрэнцыі. У рэзалюцыі павінны быць асабліва падкрэсьлены і адзначаны моманты барацьбы з буржуазнай ідэолёгіяй і фінансава-гаспадарчыя пытаньні.

Пасьля дакладу адбыліся гарачыя спрэчкі. Некаторыя таварышы з месц зазначалі, што здабыцьцё рэдакцыямі друкарняў, узмацненьне працы аддзелаў рабочага жыцьця і рабочых карэспандэнцыяў адразу палепшыла-б становішча газэты, выклікала-б значную рабочую падпіску і г. д. Большасьць выказвалася за тое, што друк патрабуе вялікага дзяржаўнага падтрыманьня, каб ён мог жыць поўным жыцьцём, каб ажыцьцяўляў у неабходнай меры стаячыя перад ім заданьні і даваў усялякім надворным уплывам апор. Неабходна зьмяніць партыйную палітыку ў адносінах к друку. Трэба, напасьледак, пачаць ажыцьцяўленьне пастановаў XI партыйнага зьезду і прыватнай нарады дэлегатаў астатняй партыйнай канфэрэнцыі. Катастрафічнага становішча друку наогул няма. Шмат газэт якасьцю палепшылася, цiраж верасьні павялічыўся. Трэба, каб праца палепшаньня ішла на толькі напрамку журналісьціві, але, гаўным чынам, у партыйным і сам напрамку.

ія выпрацоўкі рэзалюцыі была абрана спэцыяльная камісія.

У прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаучага Камітэту Беларусі.

Парадак высяленьня грамадзян з кватэр.

У дадатак к ранейшай пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту вынесена вось якая пастанова:

Грамадзяне, якія высяляюцца з займаемых імі памяшканьняў, можа рабіцца па судзебнаму прыгавору, апроч выпадкаў крадзяжу ці неплацяжа кватэрнай платы і яшчэ вось па якіх прычынах:

а) Калі павядзеньне асобы робіць немагчымым сумеснае з ім жыхарства ў пакою ці кватэры.

б) Калі асоба ўсялілася ў памяшканьне без належнага права з парушэньнем істнуючых законных праў.

в) У выпадку патрэбы ў капітальным рамонце, засьведчанай органамі тэхнічна-будаўнічага нагляду, пад непраменнай умовай, што па выпаўненьні рамонту памяшканьне павінна быць аддадзена, калі гэтага пажадаюць, асобы, якія жылі ў памяшканьні да выпаўненьня рамонту.

г) Народнаму Камісарыяту Унутраных Спраў сумесна з Народным Камісарыятам Юстыцыі ў двухтыднёвы тэрмін выдаць інструкцыю па ўжываньню гэтай пастановы.

Дармовая паша жывёлы.

Пастаноўлена ў гэтым годзе платы за пашу жывёлы ў лясох ня браць. Адначасова прызнана патрэбным прыцягваць жыхарства к ачыстцы лясных вучасткаў, даючы ім за гэта права на пашу жывёлы на гэтых ці бліжэйшых лясных вучастках.

Праверка тратнасьці лясных матар'ялаў.

З мэтай праверкі лесу, які адпушчаецца на дарожнае будаўніцтва, прапанавана Народнаму Камісарыяту Земляробства і Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі выявіць, колькі адпушчана для гэтай мэты лясных матар'ялаў і як яны трацяцца.

Дапамога вайсковай каапэрацыі.

У зьвязку з хадайніцтвах аб звольненьні вайскова-каапэрацыйных органаў Беларусі ад усіх збораў за першую палову 1922 году, пастаноўлена зволіць вайсковую каапэрацыю ад мясцовых падаткаў і хадайнічаць перад цэнтрам аб звольненьні ад астатніх падаткаў.

Управа Вышэйшых Навуковых установаў Беларусі.

З мэтай згуртаваньня дзейнасьці вышэйшых навуковых установаў Беларусі і аб'яднаньня кіраваньня імі ўхвален статут аб заснаваньні пры Цэнтральным Камітэце Беларусі Управы Вышэйшых Навуковых Установаў Беларусі ў складзе 4 членаў: Намесьніка Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, Народнага Камісара Асьветы ці галоўнага інспэктара прафэсыянальнай асьветы, Народнага Камісара Земляробства і старшыні Савету Прафэсыянальных Саюзаў Беларусі.

На Управу Вышэйшых Навуковых Установаў ускладаецца кантроль над вышэйшымі навуковымі ўстановамі ў палітычнай і навуковай адносінах і кіраўніцтва адміністратыўна-гаспадарчым бокам іх жыцьця.

Вестні з месц.

Прыёмка жывёлы дальніх валасьцёў.

(Варысаўскі павет).

Павятовым камітэтам харчаваньня арганізован адсобны прыёмны пункт у савецкай гаспадарцы Мсьціж для прыёмкі жывёлы, якая здаецца па харчоваму падатку дальшімі валасьцямі: Вяліка-Далецкай, Бягомльскай, Бярэзінскай і Асоўскай.

Папраўка дарог і мастоў.

У зьвязку са здачай харчовага падатку у сьпешным парадку заканчваецца папраўка і пабудаваньне мастоў на дарогах.

Ф. І.

Бюльлетэнь № 65

Менскай Мэтэаролёгічнай Ста
Галоўнай Фізычнай Обсэрвато
пры Менскай Дасьледчай Балотнай

За 3 і 4 кастрычніка 1922 году.

СТРУМЭНТ.	1 гадзіна дню.	9 гадзі вечара.	
Баромэтр	736,9 m/m	738,1 m/m	
Тэрмомэтр	7,8°	5,0°	
Максымальны тэрмомэтр	8,0°	8,0°	
Мінімальны тэрмомэтр	6,2°	5,2°	
Вільгаць параўнаўчая	94%	94%	97
Асадкі ў міліметрах	—	—	0,
Грунтавы тэрмомэтр на глыбіні 0,8 м.	8,8°	8,8°	8,
« » « » 0,4 мэтра	8,0°	8,2°	8,0°

Днём дробны дождж.

Нам пішуць.

К суду хуліганаў!

Ёсьць у нашым Менску, так званыя, ціхія вуліцы, на якіх і па сягоньнешні час панує ідыльлія недалёкай мінуўшчыны польскай акупацыі, калі грабежствы і гвалты чыніліся сярод белага дня, без усялякага страху кары. Гэткая дзікая гісторыя мела мейсца 3-га гэтага месяца на Белацаркоўнай вуліцы ў д. Валькевіч № 3, кв. № 2, дзе ўжо больш двух год жыве сям'я служачага Наркамасьветы тав. Чаржынскага. Дачка дамаўласьніцы прыехала гэтымі днямі з Сібіры, дзе яна жыла з 1915 году. Ёй патрэбна былы кватэра Чаржынскіх. Нічога ня маючы проціў таго, каб уступіць сваю кватэру дачцы дамаўласьніцы, тав. Чаржынскі пачаў шукаць кватэры. Хлапатаў ён пэлы тыдзень аб гэтым у Камхозе праз свой Прафсаюз, але пакуль што, за некалькі дзён, тав. Чаржынскаму кватэры знайсьці не ўдалося.

І вось дачка гаспадыні задумала сама ўчыніць высяленьне з кватэры. Як т. Чаржынскі пашоў на службу, яго жонка на рынак, а ў кватэры засталася толькі сястра жонкі з паўтарагадовым дзіцём, дачка гаспадыні з сваімі суседкамі з Белацаркоўнай вул. д. № 4,—жонкай і дачкой міліцыянэра Палубінскага,—уварваліся ў кватэру т. Чаржынскага. Палубінская выкінула за дзьверы сястру Чаржынскай з дзіцём, пры чым пакалечыла дзіцё да крыві.

І ўтрох,—жонка і дачка міліцыянэра Палубінскага і дачка гаспадыні, як нявеста другога міліцыянэра, — учынілі «высяленьне». Нарабілі ў хаце праўдзівы пагром, таптали пад ногі вопраткі, кнігі і іншую маемасьць Чаржынскіх і выцягвалі абстаноўку к сабе (мэбель належыць да дамаўласьніцы).

На крык сястры Чаржынскай зьбегліся суседзі. Але пагромшчыцы гаварылі ім: «Мы не баімся,—мой муж міліцыянэр і мой жаніх міліцыянэр!»

Неўздавольваючыся гэтым, пагромшчыцы адчынілі вакно ў кватэры Чаржынскага і крычалі на ўсю вуліцу, лаючы сястру Чаржынскай «жыдоўкай» і «вархуцкай».

Ужо пад абарончай узброенай міліцыі вярнуліся Чаржынскія ў сваю кватэру. У кватэры яны знайшлі адны толькі голыя сьцены і кучы пакіданых патоптаных рэчаў Чаржынскіх. Каштоўныя рэчы і грошы Чаржынскіх зьнікі з кватэры.

Жонку міліцыянэра Палубінскага і дачку гаспадыні, нявесту другога міліцыянэра, саб[illegible] ў Гнаўрозыск, але праз [illegible] іх выпусьцілі на [illegible].

Цікавасьці дзеля таго, што жыхаркі знаходзяцца ў такім блізкім сваяцтве з міліцыянэрамі, яны па будуць пакараны паводдуг заслуг?

Дасьледчыць аб гэтай дзікай гісторыі могуць усе блізкія суседзі Чаржынскіх з Белацаркоўнай вуліцы.

З. Б.

Па Менску.

Рух беспрацоўя.

У працягу верасьня беспрацоўе трохі павялічылася. На 1-га верасьня ў Менску лічылася 2453 беспрацоўных, на 15 га верасьня—2999. Найбольшыя групы беспрацоўных: савецкія працаўнікі—1261, мэталісты—133, працаўнікі швэйнай прамысловасьці—175. Ад 1-га да 15 га верасьня пасланa на працу 880 чалавек, з якіх 346 чорнарабочых і 211 будаўнічых рабочых.

Учот вайсковаабавязаных.

У Менскім Паветовым Вайсковым Камісарыяце нават кана цяпер справа з учотам вайсковаабавязаных. Кожны дзень выдаецца каля 70 учотных картачак. Многа дапамагае яўны ўхіляючыхся ад учоту міліцыя, якая бяз учотнай картачкі не дае віду на жыхарства.

Усебеларускі зьезд камуністычнага саюзу моладзі.

4-га кастрычніка у памяшканьні цэнтральнага камітэту саюзу моладзі адчыніўся 4 усебеларускі зьезд. Зьехаліся прадстаўнікі ад усіх паветаў.

Барацьба з дэзэртырствам.

У бліжэйшы час на Менскім павеце канчаецца праца па барацьбе з дэзэртырствам. Павет падзелен на 3 раёны, у якіх апэрыруюць спэцыяльныя атрады па барацьбе з дэзэртырствам.

Абсьледаваньне [illegible] ных бібліят[illegible]

У Менску і на пав[illegible] заны камісіі для абсл[illegible] бібліятэк пры партыйн[illegible] У камісіі ўваходзяць сп[illegible] Галоўнай Палітычна[illegible] Управы. Мэтай аб[illegible] зьяўляецца ўмацава[illegible] нага і тэхнічнага бок[illegible] атэк.

Праца ва Ў[illegible]

На Факультэце [illegible] вук і Пэдагагічны[illegible] таньне лекцыяў [illegible] ніка. 5-га каст[illegible] не дню на Ш[illegible] спэцыяльна на[illegible] ні адбудзецца [illegible] гіі для студэ[illegible] культэту.